# АНАТОЛЬ ІЛЬІЧ ВЯРЦІНСКІ



18 лістапада 1931 г.

в.Дзямешкава,Лепельскі раён, Віцебская вобл.

Простая сялянская сям’я

# АДУКАЦЫЯ І ПРАЦА

- 1956 г.-скончыў філалагічны факультэт БДУ.
- Працаваў журналістам,выкладчыкам у раённых газетах.
- З'яўляўся рэдактарам газеты "Літаратура і мастацтва", рэдактарам выдавецтва «Беларусь».
- З'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларусі.
- Удзельнічаў у 1977 у рабоце XXXII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.
- З'яўляўся членам ПЭН-цэнтра.

# ТВОРЧАСЦЬ

Анатоль Вярцінскі – гэта Беларускі паэт; драматург, публіцыст,крытык,перакладчык.

- Першыя вершы надрукаваны ў студэнтцкай газеце ў 50-ых гадах.( «Беларускі ўніверсітэт», «Чырвоная змена»,у часопісе «Маладосць» ).
- «Песня пра хлеб»-першы паэтычны зборнік(1962). У ім не было твораў з цікаўнымі сюжэтамі і вобразамі, а апавядалася пра вясковае і студэнцкае жыццё, мінулую вайну. Каларытна напісана змешчаная ў гэтым зборніку аднайменная паэма, у якой паэтызуецца праца хлебароба, сялянскі побыт, духоўная прыгажосць працоўнага чалавека. Паэма — гімн хлебу, сялянскай печы, маці, чалавечай працы. Паэт у сваіх узвышаных роздумах сягае думкай у прасторы сусвету, аднак пры гэтым не адрываецца ад зямлі, ад жыццёвай асновы.

- Паасобныя вершы пакладзены на музыку. Па паэме «Колькі лет, колькі зім!» пастаўлены тэлеспектакль (1980). Вершы і п'есы Анатоля Вярцінскага перакладаліся на многія мовы свету. У 2005 годзе выйшаў у перакладзе на ўкраінскую мову зборнік яго выбраных твораў.
- А. Вярцінскі напісаў п'есы для дзяцей «Дзякуй, вялікі дзякуй» (1978, пастаўлена ў 1974), «Скажы сваё імя, салдат» (1977, пастаўлена ў 1975), «Гефест — друг Праметэя» (1983, пастаўлена ў 1984). У 1983 г. выйшаў зборнік п'ес пад назвай «Дзякуй, вялікі дзякуй».

- Пераклаў на беларускую мову п'есы Лопэ дэ Вэгі «Раба свайго каханага», М. Себасцьяна (руск.) бел. «Безыменная зорка (англ.) бел.», В. Пальчынскайтэ (літ.) бел. «Спяшаюся за летам», якія пастаўлены ў тэатрах рэспублікі, а таксама асобныя вершы з класічнай і сучаснай рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, балгарскай, польскай, венгерскай, кубінскай



# АСНОЎНЫЯ ЖАНРЫ

- Прытча(“Дурман”, “Мы,мёд і пчала”);
- Вершы-звароты(“Медсястры”, “Просьба”);
- Ода(“Мы напачатку зазналі страху”, “Навагодні тост”);
- Элегія(“Баіцца беларус быць беларусам”);
- Балада(“Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня”);
- Вершы-прысвячэнні(“Скажы мне,мама”);

# Бібліяграфія

- «Песня пра хлеб». Кніга паэзіі. 1962 г.
- «Тры цішыні». Кніга паэзіі. 1966 г.
- «Чалавечы знак». Кніга паэзіі. 1968 г.
- «Выбранае». Кніга паэзіі. 1973 г.
- «З'яўленне». Кніга паэзіі. 1975 г.
- «Час першых зорак». Кніга паэзіі. 1976 г.
- «Ветрана». Кніга паэзіі. 1979 г.
- «Высокае неба ідэала». Кніга публіцыстыкі. 1980 г.
- «Святло зямное». Кніга паэзіі. 1981 г.
- «Дзякуй, вялікі дзякуй». Зборнік п'ес для дзяцей. 1983 г.
- «Нью-Йоркская сірэна». Кніга публіцыстыкі. 1987 г.
- «Хлопчык глядзіць». Кніга паэзіі. 1992 г.
- «Трывожны досьвітак». Кніга публіцыстыкі. 1994 г.
- «Жанчына. Мужчына. Каханне...». Кніга паэзіі. 2003 г.
- «Жыцьмем. Вершы і паэмы». 2012 г.

# Зборнік і твораў

У асноўным,творам А. Вярцінскага ўласцівы высокі грамадзянскі пафас, філасафічнасць, аналітычнасць, вострая публіцыстычнасць. Паэт асэнсоўвае «вечныя» праблемы чалавечага існавання, маральныя каштоўнасці жыцця, услаўляе духоўную веліч чалавека, выкрывае абыякавасць і самазадаволенасць.















Вершы А.Вярцінскага вельмі розныя,але па-свойму цікавыя.

**Рыфма ў вершах А. Вярцінскага вызначаецца багаццем сугуччаў, яркасцю, кантрастнасцю. На яе звычайна падае лагічны націск у вершаваным радку, звяртаецца найбольшая ўвага:**
**Перагукванне слоў, падабенства іх гукавой абалонкі як бы наглядна паказвае небяспеку памыліцца, прыняць адну з'яву за іншую.**

Мужчына. Жанчына.
Чаканне.
Шуканне. Блуканне.
Час.
Жанчына. Мужчына.
Спатканне.
Вітанне. Пытанне.
Адказ.
Мужчына. Жанчына
Дыханне.
Сэрцабіццё. Забыцц
Жанчына. Мужчына
Каханне.
Мужчына. Жанчына
Жыццё.



Гэта прыкмета з прыкмет,
калі ўсё адзіна сведчыць:
табе належыць све
табе дарована вечнасць...

Пра месца ў жыцці, як дзеці,
гадаем,
думаем, снім.
Месца маё ў свеце —
месца ў сэрцы тваім.

# “Рэквіем па кожным чацвёртым”

Тэма вайны вельмі цяжкая для беларусаў,бо менавіта наша краіна больш за ўсіх несла пакуты ў Вялікай Айчыннай вайне.

ПРАПАНОЎВАЮ ДЛЯ ПРАСЛУХВАННЯ



# Самыя вышэйшыя ўзнагароды ў жыцці




- Лаўрэат прэміі «Залаты апостраф» (201
- Медаль 100 гадоў БНР Рады Беларуска Народнай Рэспублікі (2018).
- Дзяржаўнай прэмія Беларусі 1988 за публіцыстычныя нататкі "Нью-йоркская




